УДК 631.115.6-057.1(476)(091)“1953/1985”

# Спецыялісты масавых прафесій у сельскай гаспадарцы Беларусі (1953–1985 гг.)

**Смяховіч М.У.**
*Дзяржаўная навуковая ўстанова “Інстытут гісторыі НАН Беларусі”, Мінск*

*У перыяд з 1953 па 1985 г. партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва СССР і БССР значную ўвагу надавала вырашэнню харчовага пытання. Вынікі працы калгасаў і саўгасаў у напрамку вырашэння гэтага пытання залежалі ад многіх складнікаў.*

*Мэта артыкула – вызначэнне перадумоў, якія аказалі істотны ўплыў на прафесійную падрыхтаванасць і матывацыю працы спецыялістаў масавых сельскагаспадарчых прафесій.*

***Матэрыял і метады.** Даследаванне працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў масавых прафесій для калгасна-саўгаснай вытворчасці, вызначэнне месца і ролі гэтай катэгорыі сялянства ў вырашэнні аграрнага пытання грунтавалася на архіўных матэрыялах (фонд 4-п, вопісы 46, 160; фонд 48, вопісы 9 і 14; фонд 30, вопісы 9, 13; фонд 31, вопіс 9; фонд 7, вопіс 10 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь). Выкарыстоўваліся агульнанавуковыя (аналіз, параўнанне і абагульненне) і канкрэтна-гістарычныя (гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны) метады.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** У перыяд з 1953 па 1985 г. асноўнай вытворчай сілай калгасаў і саўгасаў былі жывёлаводы і паляводы. Гэтая група вяскоўцаў вызначалася невысокім адукацыйным цэнзам, недастатковай прафесійнай падрыхтаванасцю. У мэтах забеспячэння калгасаў і саўгасаў спецыялістамі-жывёлаводамі і паляводамі ў БССР была створана пэўная сістэма падрыхтоўкі такіх кадраў. У 1950-я гг. аснову гэтай сістэмы складала курсавая форма навучання, у 1960–1970-я гг. значная роля адводзілася народным універсітэтам, школам перадавога вопыту, падрыхтоўцы спецыялістаў у філіялах сельскагаспадарчых прафесійна-тэхнічных вучылішчаў (СПТВ). Разам з тым фармальна бюракратычныя адносіны калгаснага кіраўніцтва да ўліку інтарэсаў жывёлаводаў, цяжкія ўмовы працы, адсутнасць адпачынку, выхадных дзён і малыя заробкі не матывавалі калгаснікаў да павышэння прадукцыйнасці працы, што тармазіла развіццё аграрнай вытворчасці.*

***Заключэнне.** Гэтыя фактары стрымлівалі развіццё аграрнай вытворчасці, аказвалі негатыўны ўплыў на вырашэнне кадравага пытання ў жывёлагадоўлі.*

***Ключавыя словы:** фактар, уплыў, падрыхтоўка, спецыяліст, калгасы і саўгасы, курсы, народныя ўніверсітэты, школы перадавога вопыту, жывёлаводы, умовы працы.*

# Experts of Mass Professions in Agriculture of Belarus (1953–1985)

**Smiakhovich M.V.**
*State Scientific Institution “Institute of History of NAS of Belarus”, Minsk*

*Party and state leadership of the USSR and the Belarusian SSR paid considerable attention to the solution of the food problem in 1953–1985. The results of the collective and state farms, concerning this issue, depended on many components.*

*The aim of this publication is to identify prerequisites that had a significant impact on the professional training and motivation of mass agricultural occupations experts.*

***Material and methods.** Research of the process of training mass occupations experts for collective and state farms, the definition of the place and role of this category of the peasantry in the solution of the agrarian problem was based on archival materials: 4-p fund, inventory 46, 1604; 48 fund, inventory 9 and 14; fund 30, inventory 9, 13; 31 fund, inventory 9; 7 fund, inventory 10 of the National Archives, as well as on scientific publications. The methodology of the research is based on the principles of dialectical materialism: objectivity, historicism, the connection with social practice; scientific methods,*

*such as analysis, comparison and synthesis; concrete historical methods such as historical and typological, historical and systemic.*

***Findings and their discussion.*** *The main production force of collective and state farms was livestock breeders and field workers in 1953–1985. This group of villagers had low educational qualifications, lack of professional training. A specific system of personnel training was created in Belorussia to provide livestock specialists and field workers for collective and state farms. The basis of this system was in the form of course training in the 1950s. A significant role was played by the People's University, schools of advanced experience, the training of specialists in the branches of agricultural technical training colleges in 1960–1970s. However, the formal bureaucratic attitude of the collective farm management to breeder's interests, poor working conditions, and lack of rest, holidays and small income didn't motivate farmers to increase productivity, which hindered the development of agricultural production.*

***Conclusion.*** *These factors hindered the development of agricultural production; had a negative impact on personnel matters in livestock breeding.*

***Key words:*** *factor, influence, training, specialist, collective and state farms, courses, people's universities, schools of advanced experience, livestock breeders, working conditions.*